Малітва праз заступніцтва св. Джаны Берэты Молы

Аўтар: Рэдакцыя
05.12.2021 00:00



Сусвету ва ўсе часы былі ўласцівы свае бедствы. Біч сучаснасці, між іншым, – анкалагічныя захворванні і праблема абортаў, пытанне якіх вельмі востра стаіць у соцыуме. Бог жа ў сваёй любові клапоціцца пра кожнага з нас, адказваючы на актуальныя патрэбы. Таму мы атрымалі асаблівых нябесных апекуноў: св. Джану Берэту Молу – заступніцу цяжарных маці і зачатых дзяцей, і св. Перэгрына Лазіозі – заступніка людзей, хворых на рак. † Божа, наш Ойча, мы праслаўляем і бласлаўляем Цябе, таму што ў асобе Джаны Берэты Молы Ты дазволіў нам пазнаць жанчыну, якая як дзяўчына, жонка, маці і доктар з'яўляецца сведкай Добрай Навіны. Мы таксама ўдзячныя Табе за тое, што праз дар яе жыцця вучыш нас прымаць і паважаць кожнага чалавека.

Ты, Пане Езу, быў для яе найважнейшым арыенцірам: яна магла знайсці Цябе ў прыгажосці свету прыроды; разважаючы аб выбары ўласнага жыццёвага шляху, яна шукала Цябе і таго, як лепш Табе служыць; у сужэнскай любові стала знакам Тваёй любові да Касцёла і людзей; як і Ты, Добры Самаранін, яна спынілася побач з кожным хворым, малым і слабым чалавекам; па Тваім прыкладзе і дзеля любові аддала сябе, нарадзіўшы новае жыццё.

Малітва аб цудзе

Пане Езу, я стаю перад Табою такім, які я ёсць. Прашу прабачэння за мае грахі, шкадую пра іх, прабач мне, калі ласка. У імя Тваё я дарую ўсім тое, што яны зрабілі

супраць мяне. Выракаюся сатаны, злых духаў і іх спраў. Аддаю сябе Табе, Пане Езу, цяпер і назаўсёды. Запрашаю Цябе ў сваё жыццё, прымаю Цябе як свайго Госпада, Бога і Адкупіцеля.

Вылечы мяне, змяні мяне, умацуй мяне целам, душой і розумам. Прыйдзі, Пане Езу, атулі мяне Тваёй найдаражэйшай Кроўю і напоўні Тваім Святым Духам. Я люблю Цябе, Пане Езу. Дзякую Табе. Я хачу ісці за Табой у кожны дзень свайго жыцця. Амэн.

Марыя, Маці мая, Каралева Супакою, святы Перэгрын, заступнік хворых на рак, усе анёлы і святыя, калі ласка, прыйдзіце мне на дапамогу.